**Назва ТВП:** Арэхаўскае







© С. Левый

**Код:** BY051

**Геаграфічныя каардынаты:** 51° 38' N 23° 55' E

**Адміністрацыйная прыналежнасць:** Брэсцкая вобласць: Маларыцкі раён

**Плошча:** 3814 га

**Крытэрыі:** A1, B3

**Нацыянальны прыродаахоўны статус:** частка тэррыторыі ў складзе Біялагічнага заказніка мясцовага значэння «Арэхаўскі» (1510 га)

**Міжнародны прыродаахоўны статус:** ТВП міжнароднай значнасці, утворана ў 2010 годзе. Перспектыўная частка беларускага сектару міжнароднага біясфернага рэзервату «Заходняе Палессе»

**Агульнае апісанне:**

Тэрыторыя ўяўляе сабою адносна невялікі леса-водна-балотны комплекс, у склад якога ўваходзяць: вялікі вадаём – воз. Арэхаўскае, цалкам захаванае ў натуральным стане; затоплены ўчастак выпрацаваных торфапляцовак, на якім адбываюцца працэсы другаснага забалочвання; а таксама размешчаныя навокал лясныя массівы, фрагменты нізінных і пераходных балот і лугоў.

Ядром ТВП з’яўляецца воз. Арэхаўскае і былая торфапляцоўка - ўрочышча Разлівы. Возера размешчана ў басейне р. Рыта, правага прытоку р. Мухавец – басейна р. Заходні Буг і з’яўляецца пятым па плошчы ў басейне Бугу і самым вялікім натуральным вадаёмам беларускай часткі басейну. Максімальная даўжыня возера 3,11 км, шырыня 2,03 км, сярэдняя глыбіня каля 1 м. Берагі нізкія моцна забалочаныя, парослыя лесам. Сучасны гідралагічны рэжым басейна возера абумоўлены рэалізаванымі ў 1965-1984 гг. гідрамеліяратыўнымі мерапрыемствамі, у выніку якіх плошча вадасбору паменшылася ў 17 разоў (Якушко, Власов, 1998). Негледзячы на значныя змяненні ў паверхні вадазбору, само возера і яго ўзбярэжжы захавалася ў натуральным стане. У 1984 годзе на паўночны-захад ад возера пачалася распрацоўка торфапляцоўкі «Арэхава-2» ва ўр. Разлівы. Пераразмеркаванне вады ажыццяўлялася пры дапамозе часовай насоснай станцыі ў воз. Арэхаўскае, далей у раку Маларыта і праз сістэму каналаў у воз. Олтушскае. На пачатку 1990-х гадоў торфаздабыча і адпампоўванне вады былі прыпынены. Пасля гэтага пачалося інтэнсіўнае другаснае забалочванне тэрыторыі торфапляцоўкі. Сёння былая торфапляцоўка прадстаўляе сабой другасна затоплены і забалочаны мелкаводны вадаём з сеткай унутранных і абвадных каналаў. У паўночнай частцы торфапляцоўка і возера злучаны каналам. Падчас летне-асенняй межані гэтая сувязь перарываецца. У апошнія гады гідралагічны рэжым возера і торфапляцоўкі стабілізаваўся. На паўднёв-усходняй граніцы ТВП размешчаны канал які дае пачатак р. Маларыта.

Асноўнымі экасістэмамі найбольш распаўсюджаннымі ў межах ТВП з’яўляюцца: водныя (натуральных і штучных вадаёмаў), лясныя, а таксама лугавыя і балотныя. Пераважаюць лясныя, балотна-лугавыя, узбярэжна-водныя раслінныя супольнасці. Вышэйшая водная расліннасць займае каля 33% паверхні возера і каля 50% паверхні торфапляцоўкі. З надводнай расліннасці дамінуе трысняг, субдамінантамі з’яўляюцца камыш азёрны і рагоз вузкалісты. Вялікай разнастайнасцю асацыяцый характэрызуюцца вадаёмы ўр. Разлівы, дзе назіраецца больш менш раўнамернае чаргаванне зарасляў надводнай расліннасці і ўчасткаў адкрытай вады. У межах ТВП таксама размешчаны самы вялікі на паўднёвым захадзе і ў межах беларускай часткі басейну р. Заходні Буг поймавы луг, які

захаваўся ў натуральным стане. Прадстаўлены таксама асобнымі участкамі пераходныя і нізінныя балоты. Дзякуючы разнастайнасці прыродных ўмоў тут таксама прадстаўлены разнастайныя лясы (разам 13 тыпаў). Найбольш распаўсюджаны сасновыя, бярозавыя і альховыя лясы. Сустракаюцца асобнымі фрагментамі дубовыя лясы.

У межах ТВП размешчаны невялікі населены пункт – вёска Перавысь, ля граніц вёскі: Арэхава і Дрочава. Граніцы ТВП выразна азначаны асабліва на захадзе і поўдні (граніца з Украінай) поўначы (аўтамабільная дарога Р17 Кобрын-Уладава), усходзе гравійнымі і грунтовымі дарогамі. ТВП мяжуе з Шацкім прыродным нацыянальным паркам і біясферным рэзерватам – Україна.

## Асноўныя біятопы:

лясы – 70% (у асноўным сасновыя), азёры – 12%, другасна забалочанныя тарфянікі – 5%, палі – 5%, нізінныя і пераходныя балоты – 5%, поймавыя лугі - 3%.

## Птушкі:

Арнітафаўна ТВП налічвае 182 віда птушак з 46 сямейств 17 атрадаў. На гнездаванні адзначана 134 віда з 41 сямейства 16 атрадаў. Толькі на міграцыі адзначана 37 відаў і 8 відаў з’яўляюцца залетнымі. На тэррыторыі ТВП адзначана каля 40 відаў птушак з Чырвонай кніі Рэспублікі Беларусь. У тым ліку: 6 відаў - II катэгорыя аховы, 19 - III и 11 – IY. З іх 21 від з’яўляецца гняздуючым ці гнездаванне верагодна, у тым ліку па катэгорыям: II катэгорыя аховы – 4 відаў, III катэгорыя аховы – 11 відаў, IY катэгорыя аховы - 6 відаў. Акрамя гэтага адзначана 9 відаў птушак з спіска відаў патрабуючых увагі, 5 з іх гняздуюць тут.

Тэррыторыя ТВП з’яўляецца важным месцам гнездавання многіх водна-балотных і лясных птушак, у тым ліку глабальнага пагражамых відаў вялікага грыцука *Limosalimosa*і дубальта *Gallinago media*. Вясною мае важнае значэнне для мігруючых птушак (гусі, качкі, kулікі).

Міжнароднае значэнне тэрыторыі абумоўліваецца наяўнасцю відаў маючых Еурапейскі і глабальны прыродаахоўны статус. Тут адзначаны на гнездаванні віды, якія згодна з міжнародным саюзам аховы прыроды (IUCN), адносяцца да катэгорыі ўязвімыя (V): чапля-лазняк *Ixobrychus minutus*, качка-шылахвостка *Anas acuta*, арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla*, дубальт *Gallinago media*. Яшчэ 14 відаў адносяцца да катэгорыі рэдкія (R). Больш за 30 гняздуючых відаў маюць

Еурапейскі Статус Пагрозы (European Threat Status) катэгорыі: D – памяншаючыя колькасць, R – рэдкія, V – уязвімыя.

## Іншыя групы жывел:

На тэрыторыі ТВП адзначана больш за 30 відаў млекакормячых, у тым ліку такія віды як: лось, бобр, выдра, арэшнікавая соня і інш. Адзначана 6 відаў амфібій і 6 відаў рэптылій.

## Стан рэдкіх відаў птушак:

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды (2004-2010) | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Гусь шэрая *Anser anser* | гн | 2-5 п | 2004-2010 | П | | |
| Качка-неразня *Anas strepera* | гн | 15-20 п | 2004-2010 | Д | ↔ | В2 |
| Качка-шылахвостка *Anas acuta* | гн | 0-1 п | 2004-2010 | П | | |
| Савук-луток *Mergus albellus* | мг | + | 2004-2010 | П | | |
| Савук даўганосы *Mergus serrator* | мг | + | 2004-2010 | П | | |
| Савук вялікі *Mergus merganser* | мг | + | 2004-2010 | П | | |
| Гагач чорнаваллёвы *Gavia arctica* | мг | + | 2004-2010 | П | | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды (2004-2010) | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Коўра шэрашчокая *Podiceps grisegena* | гн | 1-3 п | 2004-2010 | П | | |
| Чапля-бугай *Botaurus stellaris* | гн | 15-20 п | 2004-2010 | Э | ↔ | |
| Чапля-лазянік *Ixobrychus minutus* | гн | 2-5 п | 2004-2010 | П | | |
| Чапля-кваква *Nycticorax nycticorax* | зал | + | 2004-2010 | П | | |
| Чапля вялікая белая *Casmerodius albus* | мг | + | 2004-2010 | П | | |
| Чорны бусел *Ciconia nigra* | гн | 1-3 п | 2004-2010 | П | | |
| Арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla* | гн | 1 п | 2004-2010 | П | | |
| Малы арлец *Aquila pomarina* | гн? | + | 2004-2010 | П | | |
| Скапа *Pandion haliaetus* | мг | + | 2004-2010 | П | | |
| Сокал-кабец *Falco subbuteo* | гн? | + | 2004-2010 | П | | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды (2004-2010) | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Пагоніч малы *Porzana parva* | гн | 25-30 п | 2004-2010 | Э | ↔ | B3 |
| Драч *Crex crex* | гн | 15-20 с | 2004-2010 | Э | ↔ | |
| Журавель шэры *Grus grus* | гн | + | 2004-2010 | П | | |
| Зуёк вялікі *Charadrius hiaticula* | мг | + | 2004-2010 | П | | |
| Сеўка залацістая *Pluvialis apricaria* | мг | + | 2004-2010 | П | | |
| Баталён *Philomachus pugnax* | мг | + | 2004-2010 | П | | |
| Стучок *Lymnocryptes minimus* | мг | + | 2004-2010 | П | | |
| Дубальт *Gallinago media* | гн? | + | 2004-2010 | П | | |
| Грыцук вялікі *Limosa limosa* | гн | 10-15 п | 2004-2010 | Д | ↔ | A1 |
| Кулён сярэдні *Numenius phaeopus* | мг | + | 2004-2010 | П | | |
| Кулён вялікі *Numenius arquata* | мг | + | 2004-2010 | П | | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды (2004-2010) | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Кулік-селянец *Tringa nebularia* | мг | + | 2004-2010 | П | | |
| Чайка шызая *Larus canus* | мг | + | 2004-2010 | П | | |
| Рыбачка белашчокая *Chlidonias hybrida* | мг | 60-65 п | 2004-2010 | П | | |
| Рыбачка чорная *Chlidonias niger* | гн | 0-60 п | 2004-2010 | Д | ↔ | B2 |
| Пугач *Bubo bubo* | гн | 1 п | 2004-2010 | П | | |
| Звычайны зімародак *Alcedo atthis* | гн | + | 2004-2010 | П | | |
| Жаўна зялёная *Picus viridis* | гн | 1-5 п | 2004-2010 | П | | |
| Дзяцел беласпінны *Dendrocopos leucotos* | гн | + | 2004-2010 | П | | |
| Валасяніца-белашыйка *Ficedula albicollis* | гн? | 0-2 п | 2004-2010 | П | | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды (2004-2010) | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Цвыркун салаўіны *Locustella luscinioides* | гн | 50-60 п | 2004-2010 | Э | ↔ | В3 |
| Сініца вусатая *Panurus biarmicus* | мг | + | 2004-2010 | П | | |

### Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

Насякомыя: рашэцісты жужаль *Carabus cancellatus*, жужаль фіялетавы *Carabus violaceus*, жужаль шчыгрынавы *Carabus coriaceus*, бражнік Празерпіна *Proserpinus proserpina*, малое начное паўлінава вока *Eudia pavonia*, мохавы чмель *Bombus muscorum*.

Расліны: альдраванда пухіркаватая *Aldrovanda vesiculosa,* зубніца клубняносная *Dentaria bulbifera*, шалфей лугавы *Salvia pratensis,* гайнік цёмна-чырвоны *Epipactis atrorubens.*

### Пагрозы:

- асушальная меліярацыя і будова каналаў;
- забудова ў прыбярэжнай паласе;
- некантраляваны выпал травяністай расліннасці;
- перавыпас сельскагаспадарчых жывёл;
- зарастанне адкрытых біятопаў;
- інтрадукцыя драпежнікаў;
- веснавое паляванне;
- рубкі лесу, асабліва суцэльныя галоўнага карыстання;

### Рэкамендацыі па захаванню:

- Забараніць правядзенне асушальнай меліярацыі, будаўніцтва ў прыбярэжнай

паласе, а таксама абмежаваць характар ляснога карыстання, у прыватнасці суцэльныя рубкі лесу галоўнага карыстанны.

- На дадзенай тэрыторыі мэтазгодна ў перыяд вясновай міграцыі ўводзіць абмежаванні на любую дзейнасць, асабліва паляванне.
- Неабходна кашэнне на некаторых частках лугу (штогод, або раз на два гады) у жніўні, а таксама магчыма мэтазгодна правядзенне кантраляваных палаў на прыканцы зімы пачатку вясны, калі на лузе існуе снегавое покрыва, альбо высокі узровень вады.
- Неабходны штогадовы маніторынг стану папуляцый птушак і пагроз.

## Крыніцы інфармацыі:


Абрамчук А.В. ООПТ Брестского Полесья и территория перспективная для включения в состав Белоруской части МРБ "Западное Полесье" //Экологические коридоры, методика проектирования, реализация. Международный экологический коридор реки Буг. Люблинский Католический Университет 20-21 ноября 2002 г. Пяски, 2002. – С. 156-161.

Абрамчук А.В., Абрамчук С.В., Бакур Ю.Ю., Сербун С.С., Хвалей А.С., Прокопчук В.В., Богданович И.А. Редкие гнездящиеся водно-болотные птицы аквальных лентических экосистем Брестского Полесья. //Красная книга Республики Беларусь: состояние, проблемы, перспективы. мат. Респ. науч. конф. 12-13 декабря 2002 г. УО "ВГУ им. П.М. Машерова" – Витебск: Изд-во УО "ВГУ им. П.М. Машерова". 2002. – с.32-34.

А.В. Абрамчук, С.В. Абрамчук Гнездование серого гуся в Брестском Полесье. //Прыроднае асяроддзе Палесся: сучасны стан і яго змены: Материалы международной научной конференции Брест 2002.

А.В. Абрамчук, С.В. Абрамчук Редкие виды птиц бассейнов Олтушского и Ореховского озе // Беркут. Т.11, вып. 2. 2003. – С. 148-150.

С.В. Абрамчук, А.В. Абрамчук, И.А. Богданович, А.А. Сербун Осенние скопления водно-болотных видов птиц на водоемах Брестского Полесья. // Экологической науке – творчество молодых МатериалыIII Региональной научно-практической конференцииведущих специалистов, аспирантов и студентов, Гомель, апрель 2003 года. – Гомель, 2003. – С. 5-6.

А.В. Абрамчук, С.В. Абрамчук, Ю.Ю. Бакур, И.В. Богданович, С.В. Левый, В.В. Прокопчук, А.А. Сербун, В.А. Лихван Встречи редких видов птиц в Брестской

области в 2002 г. //Авифауна Украины, Выпуск 2, 2003, с.48-52.

С.В. Абрамчук, А.В. Абрамчук С.В Гнездование белощекой крачки (Chlidoniashibridus) в Брестском Полесье // Экологические проблемы Полесья и сопредельных территорий: Материалы V Международной научно-практической конференции. – Гомель, октябрь 2003 года. – Гомель, 2003. – С. 7-8.

А.В. Абрамчук, С.В. Абрамчук Некоторые данные по редким видам птиц территорий перспективных для включения в состав Белорусского сектора международного резервата биосферы «Западное Полесье"// Состояние природных комплексов крымского природного заповедника и других заповедных территорий Украины, их изучение и охрана. Мат-лы научно-практич. конференции, посвящ. 80-летию Крымского природного заповедника. Алушта, 2003 – С. 192-194.

А.В. Абрамчук Уникальные орнитокомплексы западной части Брестского Полесья. //Брэсцкі геаграфічны веснік, том 1, выпуск 1. (Прыродныя і антрапагенныя ландшафты Палесся: праблемы прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя). Брэст, УА “ Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна” , 2003 – С. 63-74.

А.В. Абрамчук, С.В.Абрамчук, А.А.Сербун, Ю.Ю.Бакур, И.А.Богданович, В.В.Прокопчук Результаты изучения редких и охраняемых птиц в Брестском Полесье //Материалы II международной научно-практической конференции “Учеты птиц: подходы, методики, результаты”. 26-30 апреля 2004. Житомир, 2004.

Максименков М.В., Вежновец В.В., Скуратович А.Н., Дубовик Д.В., Абрамчук А.В., Абрамчук С.В. Состояние биологического состояния проектируемого заказника “Ореховский” //Прыроднае асяроддзе Палесся: асаблівасці і перспектывы развіцця: тэзісы дакл. III Міжнар. навук. канф. (Брэст, 7-9 чэрв. 2006 г.). / рэдкал.: М.В. Міхальчук (адк. рэд.), [і інш.]. – Брэст: Академия, 2006. – С. 130.

Китель Д.А. Абрамчук С.В. Абрамчук А.В. Новое место гнездования шилохвости (Anas acuta) в Беларуси. Subbuteo. 2008. – Т. 9. – С. 51-52.

Китель Д.А., Абрамчук С.В., Абрамчук А.В., Новое место гнездования галстучника (Charadrius hiaticula) в Беларуси. // Збереження та вщдтворення біорізноманіття природно-заповідных територій. Матеріалы міжнародноі навуково-практичноі конференціі, присвяченоі 10-річчю Рівненского природного заповідніка (м. Сарни, 11-13 червеня 2009 року) / Ред.кол. Будз М.Д. та ін. – Ріве, ВАТ “Рівненска тдрукарня”, 2009. – С – 450-453.

**Складальнікі :** Абрамчук А.В., Абрамчук С.В.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнет-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*